**УСТАНОВА «МІЖКУЛЬТУРНЫ ДЫЯЛОГ»**

**ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ**

---

# ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЛІСТ

Міжкультурны дыялог – адно з самых папулярных паняццяў, якое мае надзвычай шырокае значэнне і разнастайныя трактоўкі. Нягледзячы на гістарычна ўласцівы беларусам культурны, этнічны, канфесійны дыялог, сучасныя падыходы да міжкультурнага дыялогу ў Беларусі даследуюцца і практыкуюцца недастаткова актыўна.

Патрабуецца комплекснае, міждысцыплінарнае асэнсаванне феномену міжкультурнага дыялогу ў глабальным свеце, формы яго выяўлення ў нацыянальнай і міжнароднай практыцы, разуменне яго ролі і значэння для развіцця сучаснага грамадства.

Згаданыя мэты ставяцца перад удзельнікамі **Другой Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Міжкультурны дыялог: сучасныя даследаванні і глабальная практыка"**, якая ладзіцца ўстановай "Міжкультурны дыялог" і Дзяржаўным інстытутам кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ 16 мая 2014 г. (месца правядзення – Мінск, вул. Шпалерная, 7; пачатак канферэнцыі – а 10-ай г.).

Плануецца разгледзець наступныя пытанні:

- методыка і метадалогія даследаванняў міжкультурнага дыялогу;
- сучасныя канцэпцыі міжкультурнага дыялогу;
- еўрапейская і амерыканская парадыгмы міжкультурнага дыялогу;
- міжкультурны дыялог і мультыкультуралізм: тыпалогія адрозненняў;
- міжкультурны дыялог у глабальным вымярэнні;
- нацыянальная і міжнародная практыка міжкультурнага дыялогу.

Для ўдзелу ў канферэнцыі ў тэрмін да 01 мая просьба накіраваць заяўку па электроннай пошце uladykl@gmail.com або igor-igor@tut.by з указаннем імя і прозвішча, вучонага звання і пасады, кантактнай інфармацыі (электронны адрас, нумар тэлефона), назвы даклада (да 15 хв.) ці выступлення (да 5 хв.) і іх тэзісы аб'ёмам да 1 старонкі (да 4 тыс. знакаў).

Працоўныя мовы – беларуская, англійская, руская, польская, украінская.

Даведкі па тэлефонах: +375-296-73-26-21
+375-292-52-79-15

Аргкамітэт